За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 9 (104) Травень 2015 г.

Права прыватнай уласнасьці не турбуе Канстытуцыйны суд

Канстытуцыйны Суд краіны ў асобе начальніка сакратарыяту Аляксандра Каравая адмовіўся выказаць прававую пазыцыю суду наконт пытаньняў абмежаваньня і абароны права прыватнай уласнасьці. Пра гэта суд прасіў праваабаронца Леанід Сьвецік.

Фармальнай прычынай ўхіленьня канстытуцыйнага судовага органу ад вырашэньня пастаўленага перад ім пытаньня стала адсутнасьць у праваабаронцы даверанасьці на прадстаўленьне інтарэсаў грамадзян у судзе, у якіх мясцовымі органамі ўлады была адчужаная прыватная ўласнасьць (будынкі і зямельныя ўчасткі) для дзяржаўных патрэб.


Леанід Сьвецік

У сваім звароце праваабаронца паведамляў Канстытуцыйнаму суду пра тое, што яму пастаянна скардзяцца грамадзяне, у якіх мясцовымі органамі ўлады былі канфіскаваныя для дзяржаўных патрэб зямельныя ўчасткі з разьмешчанымі на іх жылымі і гаспадарчымі пабудовамі. Такія выпадкі не адзінкавыя. Толькі ў 2014-2015 гадох з такімі скаргамі да Леаніда зьвярнуліся больш за 20 жыхароў паўночнай сталіцы.

«Для мяне відавочна, што органамі дзяржаўнага кіраваньня і судамі парушаюцца канстытуцыйныя правы грамадзян у сфэры валоданьня прыватнай уласнасьцю. У прыватнасьці, парушаюцца артыкулы 13, 29, 44, 48, 60 Асноўнага закону краіны – Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», — сьцьвярджае Леанід Сьвецік.

У артыкулах, пералічаных праваабаронцам, пацьвярджаецца існаваньне як дзяржаўнай, гэтак і прыватнай уласнасьці. Згодна з Канстытуцыяй, дзяржава бярэ на сябе адказнасьць за захаванасьць правоў валоданьня і распараджэньня ўласнасьцю грамадзянамі.

Больш таго, у беларускай Канстытуцыі адназначна сказана пра тое, што прымусовае адчужэньне маёмасьці дапускаецца толькі па матывах грамадзкай неабходнасьці пры захаваньні вызначаных законам умоў і парадку яе адабраньня. Прычым адчужэньне маёмасьці прыватных асоб магчымае толькі па рашэньні кампэтэнтнага, незалежнага і бесстароньняга суду ў вызначаныя законам тэрміны, а сама канфіскацыя павінна суправаджацца поўнай і своечасовай кампэнсацыяй кошту адчужанай маёмасьці.

Але на практыцы, лічыць віцебскі праваабаронца, адбываецца інакш. Часьцяком адчужэньне прыватнай уласнасьці суправаджаецца парушэньнем канстытуцыйных прынцыпаў.

Тыповым інцыдэнтам, які даказвае існаваньне такіх парушэньняў, на думку Леаніда Сьвеціка, зьяўляецца апошні выпадак масавага адабраньня з далейшым іх зносам больш як 70-ці лецішчаў у жыхароў Віцебску. Гэтыя лецішчы знаходзяцца ў зоне магчымага падтапленьня водамі вадасховішча, якое ўзьнікне па завяршэньні будаўніцтва Віцебскай гідраэлектрастанцыі. Уладальнікі лецішчаў ня згодныя як з самім фактам адабраньня дачных участкаў і жылых будынкаў, так і з памерамі кампэнсацыяў за іх канфіскацыю для дзяржпатрэбаў.

Праваабаронца выказвае заклапочанасьць абыякавасьцю Канстытуцыйнага суду да праблем, зь якімі сутыкаюцца грамадзяне краіны пры адабраньні ў іх прыватнай уласнасьці органамі ўлады. Бо павага правоў грамадзян на валоданьне і распараджэньне ўласнасьцю зьяўляецца адным з асноватворных прынцыпаў дзяржаўнага ладу, які забясьпечвае стабільнасьць і сацыяльны спакой у грамадзтве.

«Ухіляючыся ад апэратыўнага рэагаваньня на парушэньне канстытуцыйных правоў грамадзян у сфэры аховы правоў уласнасьці, Канстытуцыйны суд не спрыяе цывілізаванаму вырашэньню праблемы, зьмяншае свой аўтарытэт і падрывае давер да сябе і сваіх рашэньняў», — мяркуе праваабаронца.

У Воршы забаранілі 6 пікетаў АГП

Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аршанскі райвыканкам не дазволіў зладзіць пікеты. Усяго партыйныя актывісты падавалі заяўкі на 6 пікетаў. Зь іх тры мусілі прайсьці 24 траўня ў вызначаных для такіх мерапрыемстваў месцах: каля кавярні "Аронія", у Парку Герояў і ў парку льнокамбінату. Яшчэ тры павінны былі прайсьці ў тых самых месцах 25 траўня.

Мэта пікетаў: давесьці да жыхароў гораду пазыцыю партыі аб недапушчэньні ўвядзеньня ў краіне прымусовай працы, што прадугледжана дэкрэтам прэзыдэнта №3.

Аднак, традыцыйна для Воршы, заяўкі на пікеты закруціліся на "карусэлі" забаронаў. Міліцыя адмовілася падпісваць з арганізатарамі дамову на ахову парадку, матывуючы гэта тым, што на правядзеньне пікетаў ня даў дазволу выканкам. А выканкам у сваю чаргу матываваў сваю адмову тым, што арганізатары не заключылі дамову зь міліцыяй. Мэдычныя работнікі, як і раней, спасылаліся на тое, што ў іхным прэйскуранце паслуг не прапісанае платнае абслугоўваньне масавых мерапрыемстваў, хаця без аказаньня такой паслугі масавае мерапрыемства, згодна з рашэньнем уладаў, правесьці немагчыма.

У Наваполацку – штрафы за вывешаны ў сквэры бел-чырвона-белы сьцяг з надпісам «БХД»

Бел-чырвона-белы сьцяг з надпісам «БХД» быў вывешаны на агароджу сквэру па вуліцы Маладзёжнай насупраць плошчы Будаўнікоў у Наваполацку 19 траўня. У той жа дзень «па гарачых сьлядох» быў пакараны 20-цю базавымі велічынямі сябра аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» **Дзьмітры Дзякаў**.



Яўген Бялянка


Праз 2 дні штраф у 10 базавых быў накладзены на студэнтку Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, якая пажадала застацца невядомай. Апошняя пастанова аб штрафе была вынесеная 26 траўня. Згодна зь ёй, 10 базавых велічынь у даход дзяржавы мусіць заплаціць **Яўген Бялянка**, гулец гандбольнага клюбу імя Лёвіна.

Усе трое падвергнутыя адміністрацыйным спагнаньням нібыта за парушэньне імі правілаў добраўпарадкаваньня і захаваньня населеных пунктаў паводле часткі 2 артыкулу 21.14 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях. Пастановы аб накладаньні штрафаў вынес начальнік аддзелу ўнутраных спраў Наваполацкага гарвыканкаму палкоўнік міліцыі Дзьмітры Разянкоў.

Падвергнуты штрафу за сьцяг першым, Дзьмітры Дзякаў, абураецца тым, што апроч яго самога пакаралі ягоных сяброў: *«Яны атрымалі штрафы толькі за тое, што выйшлі з інтэрнату амаль у той самы час, што і я, і знаходзіліся са мною ў момант затрыманьня. Начальнік аддзелу ўнутраных спраў з гэтага зрабіў выснову, што яны супольна са мной разьмясьцілі плякат, і палічыў, што гэтага дастаткова, каб накласьці на іх адміністрацыйнае спагнаньне».*

Імаверна, спачатку ў міліцыі хацелі абмежавацца пакараньнем толькі Дзякава. Бо ў першай па часе пастанове аб накладаньні штрафу пазначалася, што менавіта ён разьмясьціў на агароджы гарадзкога сквэру плякат бел-чырвона-белага колеру. У пастановах, вынесеных пазьней, фармулёўка была зьмененая, і палкоўнік міліцыі Разянкоў запісаў, што ў зьдзяйсьненьні «правапарушэньня» разам удзельнічалі трое маладзёнаў.

Чым кіраваўся наваполацкі міліцэйскі начальнік, прызначаючы розныя пакараньні за адно і тое ж правапарушэньне, не зразумела. Тым больш выклікае зьдзіўленьне розьніца ў памерах штрафаў, калі зважыць на тое, што Яўген Бялянка, які атрымаў штраф у памеры 10 базавых велічынь,



Дзьмітры Дзякаў

сваёй віны ў зьдзяйсьненьні правапарушэньня не прызнаў, у той час як Дзьмітры Дзякаў (20 б.в.), згодна з пастановай, віну прызнаў.

Палітвязьня Ігара Аліневіча пяты раз за год пакаралі карцэрам

Ігар Аліневіч адбыў 10 сутак у штрафным ізалятары. Пра гэта бацькі палітвязьня даведаліся зь ягонага тэлефанаваньня дамоў.

«Днямі пазваніў і сказаў, што адбыў 10 сутак, першамайскія сьвяты яшчэ быў у ШЫЗА, цяпер выйшаў. Прычыну пакараньня, як заўжды, не назваў. Магчыма, зноў за адмовы ўдзельнічаць у прыбіраньні, але не выключаю і іншых прычын. Яго на Першамай і раней каралі», — паведаміў бацька палітвязьня Ўладзімер Аліневіч.

Паводле падлікаў бацькоў Ігара Аліневіча, гэты было пятае за год яго пакараньне карцэрам.

«Раней ён адмаўляўся ўдзельнічаць у прыбіраньні памяшканьняў корпусу, бо гэта было не звычайнае прыбіраньне па чарзе, а выключна адносна некалькіх чалавек такія прызначэньні», — патлумачыў сытуацыю Ўладзімер Аліневіч.



Ігар Аліневіч

Актывіст анархісцкага руху Ігар Аліневіч асуджаны на 8 гадоў зьняволеньня паводле абвінавачаньня ў хуліганскіх дзеяньнях адносна адміністрацыйных будынкаў. У судзе Ігар Аліневіч сваёй віны не прызнаў і пазьней адмовіўся падпісваць прашэньне аб памілаваньні. Пасьля наваполацкай калёніі, якая была ліквідаваная, палітвязьня перавялі ў калёнію «Віцьба-3» і трымаюць там ужо амаль год.

Міністэрства інфармацыі шукае ўладальніка сайту «Свабодны рэгіён»

Ліст за подпісам міністра інфармацыі Ліліі Ананіч быў дасланы на электронны адрас, пазначаны на сайце. **«Даводзім да ведама, што на інфармацыйным рэсурсе, разьмешчаным па адрасе www.freeregion.info, выяўленыя факты парушэньня заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі. У сувязі з гэтым прапануем у тэрмін да 15 мая 2015 году падаць на адрас Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь зьвесткі, датычныя ўладальніка гэтага інфармацыйнага рэсурсу»**, — гаворыцца ў лісьце.

Міністар інфармацыі хоча ведаць, у прыватнасьці, найменьне юрыдычнай асобы (уладальніка), або прозьвішча, імя, імя па бацьку фізычнай асобы (уладальніка), а таксама юрыдычны адрас ці месца жыхарства.

Міністэрства паведамляе адрасату ліста, які пазначаны як **«уладальнік інфармацыйнага рэсурсу»** (безь імя), што **«ў адпаведнасьці з падпунктам 1.2 пункту 1 артыкулу 49 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі" ўладальніку інфармацыйнага рэсурсу выносіцца пісьмовае папярэджаньне за распаўсюд непраўдзівай інфармацыі, якая можа прычыніць шкоду дзяржаўным ці грамадзкім інтарэсам»**.

Уладальніку сайту нагадваецца: **«Апроч таго, згодна з пунктам 1 артыкулу 51^1 Закону аб СМІ па рашэньні Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь ажыцьцяўляецца абмежаваньне доступу да прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца праз інфармацыйны рэсурс, разьмешчаны ў глябальным кампутарным сеціве Інтэрнэт, у выпадку:**

— вынясеньня ўладальніку інфармацыйнага рэсурсу на працягу году двух або больш пісьмовых папярэджаньняў;

— невыкананьня ўладальнікам інфармацыйнага рэсурсу законнага патрабаваньня дзяржаўнага органу аб ліквідацыі парушэньняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі;

— распаўсюду праз інфармацыйны рэсурс інфармацыйных паведамленьняў і (або) матэрыялаў, забароненых ці абмежаваных да распаўсюду ў адпаведнасьці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама рашэньнямі суду, што набылі законную моц».

Паводле інфармацыі, зьмешчанай на «Свабодным рэгіёне», вакол сайту аб'ядналіся «ўсе здаровыя сілы Полацкага рэгіёну», прыхільнікі стварэньня грамадзкага аб'яднаньня «Свабодны рэгіён».

Сайт «Свабодны рэгіён» публікуе матэрыялы, часам кантравэрсійныя, датычныя да жыцьця як полацкага рэгіёну, так і краіны ў цэлым. Сярод пастаянных аўтараў публікацыяў сайту незалежны журналіст Уладзімер Жыгулоў, грамадзкі актывіст зь Віцебску Пётар Іваноў, вядомы віцебскі лекар-«праўдаруб» Ігар Пастноў, старшыня суполкі Свабоднага прафсаюзу ААТ «Полацак-Шкловалакно» Віктар Стукаў, аршанскі актывіст і журналіст Алесь Шутаў.

Урад Беларусі спыніў ліставаньне з КПЧ наконт скаргі жыхара Віцебску Міхаіла Жураўлёва

Падставай для гэткага радыкальнага рашэньня беларускіх уладаў стала тая акалічнасьць, што скаргу спадару Жураўлёву падрыхтаваў і ад яго імя накіраваў у Камітэт ААН па правох чалавека (КПЧ) праваабаронца Павал Левінаў.

З камэнтара ўраду вынікае тое, што беларуская дзяржава дужа пакрыўдзілася на Камітэт за рэгістрацыю скаргі Жураўлёва, дасланую Левінавым. Да таго ж незадаволенасьць дзяржавы выклікала тое, што Камітэт не зрабіў ласку паведаміць уладам пра прычыны, па якіх ахвяра — М. Жураўлёў ня змог падаць сваю скаргу самастойна. Такім чынам, беларускія ўлады мяркуюць, што была парушаная працэдура падачы скаргі ў КПЧ.


Міхаіл Жураўлёў

Акрамя таго, дзяржава — меркаваны парушальнік Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох настойвае на тым, што Камітэт па правох чалавека не павінен разглядаць ніякіх паведамленьняў ад асобы, пакуль не пераканаецца ў тым, што гэтая асоба вычарпала ўсе даступныя ўнутраныя сродкі прававой абароны.

Абгрунтоўваючы сваё патрабаваньне, беларуская дзяржава ў сваім камэнтары на скаргу Жураўлёва піша: «Інфармацыя, якая зьмяшчаецца ў паведамленьні, сьведчыць пра тое, што асобаю, ад імя якой прадстаўленае паведамленьне, не былі вычарпаныя ўсе даступныя ў Рэспубліцы Беларусь сродкі прававой абароны. Міхаіл Жураўлёў не скарыстаўся правам звароту ў Генэральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь».

Угледзеўшы ў названых фактах працэсуальныя парушэньні, беларускія ўлады адхілілі скаргу Жураўлёва і паведамілі Камітэту, што далейшы разгляд КПЧ скаргі Жураўлёва будзе расцэньвацца дзяржавай як заахвочваньне аўтара, Паўла Левінава, да дзеяньняў, якія не прадугледжаныя працэдурнымі дакумэнтамі Камітэту, і злоўжываньня правам звароту ў міжнародныя органы.

У апошнім сказе свайго камэнтара ад 26 сакавіка 2015 году ўрад Беларусі паведамляе Камітэту пра спыненьне далейшага ліставаньня зь ім наконт скаргі Міхаіла Жураўлёва.

У сваім зваротным камэнтары праваабаронца Павал Левінаў рашуча адкідае ўсе аргумэнты дзяржавы Рэспублікі Беларусь, на падставе якіх яно спыніла ліставаньне з КПЧ ААН, і ацэньвае іх як безгрунтоўныя і ў працэсуальным, і ў фактычным сэнсе.

Праваабаронца сьцьвярджае, што права накіраваць зварот у КПЧ ад імя Міхаіла Жураўлёва ён атрымаў пасьля афармленьня афіцыйнага дакумэнту — даверанасьці ад апошняга на вядзеньне справы ў Камітэце. У самым паведамленьні адзначана, што Міхаіл Жураўлёў зьяўляецца пэнсіянэрам-інвалідам і ня можа сам паўнавартасна падрыхтаваць скаргу ў КПЧ.

Варта адзначыць, што ў міжнароднай практыцы такія адносіны паміж заяўнікам і яго падапечным прызнаюцца законнымі і абгрунтаванымі і зьяўляюцца дастатковымі для абароны асоб ва ўсіх інстанцыях аж да міжнародных.

Левінаў таксама паведамляе, што пастанова судзьдзі суду Першамайскага раёну Віцебску Натальлі Караблінай, якой у кастрычніку 2012 году Міхаіл Жураўлёў быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці за распаўсюд газэты «Віцебскі Кур'ер», была абскарджаная і ў касацыйным, і ў наглядным парадку. Але ўсе беларускія судовыя інстанцыі адмовілі яму ў абароне яго грамадзянскіх правоў.

Што тычыцца аргумэнту дзяржавы, быццам бы Міхаіл Жураўлёў ня вычарпаў усе ўнутраныя сродкі прававой абароны, не падаўшы скаргу ў Генэральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь, дык насамрэч такая скарга была пададзеная ў красавіку 2013 году, і Генпракуратура даручыла яе разгляд пракурору гораду Віцебску. Пракурор гораду правам прынясеньня пратэсту на пастанову па справе аб адміністрацыйным правапарушэньні ў дачыненьні да Міхаіла Жураўлёва не скарыстаўся. Такім чынам, выводзіць Левінаў, Жураўлёвым былі вычарпаныя ня толькі ўсе ўнутраныя эфэктыўныя, але і надзвычайныя сродкі прававой абароны.

З гэтага праваабаронца робіць выснову, што ў яго дзеяньнях адсутнічаюць парушэньні працэдур ААН, на падставах якіх Камітэт па правох чалавека павінен завяршыць разгляд скаргі Жураўлёва, і настойвае на далейшым яе разглядзе.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.